ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНАЯ БІБЛІЯТЭЧКА „БЕЛАРУСЬ"

# ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСІ

МІНСК
„БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ"
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1988

ББК 63.3(2Б)
П 69

Серыя заснавана ў 1978 годзе

Аўтар-складальнік
доктар эканамічных навук М.Ф.Болбас

Рэцэнзент
кандыдат гістарычных навук З.Е.Абязгаўз

Навуковыя рэдактары
В.П.Варанцова, Н.П.Ракіцкая, В.А.Юшкевіч

Адказны за выпуск
кандыдат эканамічных навук У.А.Салановіч

Какие фабрики и заводы были в вашем городе до революции? Что они выпускали? Как были оснащены? На эти и другие вопросы ответит наша книга. Её статьи и таблицы содержат сведения о промышленных предприятиях дореволюционной Белоруссии.

Профессиональным историкам, краеведам и сотрудникам экскурсионных бюро, а также всем тем, кто любит свой край и интересуется его историей будет полезна эта книга.

П $\frac{050504000\text{-}10}{М\ 318(03)\text{-}88}$ БЗ 154=88

ISBN 5-85700-022-X

© Выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі
1988

## ПРАДМОВА

У гэтай кнізе на канкрэтным фактычным матэрыяле прыводзяцца прадпасылкі, умовы і асаблівасці развіцця прамысловасці дарэвалюцыйнай Беларусі. Ва ўступным нарысе разглядаюцца яе вытокі, станаўленне галін прамысловай вытворчасці, дынаміка іх росту, сыравінная база, рабочая сіла, аб'ёмы выпуску і рынкі збыту прамысловай прадукцыі, фарміраванне рабочага класа Беларусі. Потым у алфавітным парадку у кнізе размешчаны артыкулы пра 570 прамысловых прадпрыемстваў, на кожным з якіх працавала не менш як па 50 рабочых, прыведзены звесткі пра вытворчую дзейнасць гэтых прадпрыемстваў. У канцы кнігі змешчаны спіс больш за 1100 астатніх цэнзавых прадпрыемстваў, на кожным з якіх працавала не менш за 30 рабочых пры адсутнасці механічнага рухавіка /паравога, дызельнага, электрычнага/ або не менш за 16 рабочых пры наяўнасці рухавіка, а таксама вінакурні і спіртаачышчальныя прадпрыемствы з паравымі катламі і колькасцю рабочых не менш за 16, якія выраблялі па 1 млн. і больш градусаў бязводнага /100-працэнтнага/ спірту або па 25 тыс. і больш вёдраў адпаведнага напітку. Да буйных прадпрыемстваў аднесены таксама вадзяныя млыны, гільні, крухмальныя і алейныя прадпрыемствы з 5 паставамі /парныя млынавыя камяні/, з колькасцю рабочых больш за 10. Змешчаны звесткі пра ўсе электрастанцыі /на той час гэта была тэхнічная навінка/ і пра ўсе друкарні.

На жаль, з-за абмежаванасці аб'ёму кнігі ў яе не ўключаны 2 тыс. іншых мануфактурна-фабрычных, а таксама 6 тыс. дробных і дзесяткі тыс. рамесных прадпрыемстваў. А на Беларусі якраз пераважала дробная, дамашняя і рамесная прамысловая вытворчасць. Гэта было абумоўлена "мяжой аседласці", тым што ў гарадах і мястэчках Беларусі значны працэнт складала беднае яўрэйскае насельніцтва, а таксама боязцю буйных капіталістаў укладваць свае сродкі ў "неспакойным прыгранічным раёне" і інш. прычынамі. Раней пры аналізе ўзроўню прамысловага развіцця дарэвалюцыйнай Беларусі звесткі пра дробную, дамашнюю і рамесную прамысловасць, як правіла, не ўлічваліся, што вяло да памылковага вываду, быццам дарэвалюцыйная Беларусь па вытворчасці прамысловай прадукцыі ў некалькі разоў адставала ад шэрагу рэгіёнаў царскай Расіі.

Навват пералік буйных прадпрыемстваў, з якімі пазнаёміцца чытач гэтай кнігі, сведчыць аб тым, што на тэр. нашай рэспублікі і ў дарэвалюцыйны час працавала шмат прамысловых прадпрыемстваў з перадавой на той час тэхнікай і тэхналогіяй, выпускалася многа высакаякаснай прадукцыі, якая адзначалася ўзнагародамі на Міжнародных і Усерасійскіх выстаўках. Дарэчы,

беларускі хрусталь, шаўковыя паясы і іншыя вырабы тых часоў і зараз займаюць пачэснае месца ў экспазіцыях сусветна вядомых музеяў.

Храналагічна кніга ахоплівае перыяд ад 1795 г. /год уз'яднання ўсёй тэр. Беларусі з Расіяй/ да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У выніку гістарычнага акта ўз'яднання Беларусі з Расіяй прыкметна паскорылася эканамічнае развіццё беларускага рэгіёна: пачалося будаўніцтва чыгунак і шашэйных дарог, станаўленне рачнога параходства, пашырыліся гандлёвыя сувязі, узмацніўся рост гарадоў, больш імклівы тэмп набрала прамысловасць, якая прайшла этапы простай кааперацыі, мануфактуры, а пасля прамысловага перавароту перарасла ў фабрычна-заводскую вытворчасць. Многія з дарэвалюцыйных прадпрыемстваў пасля аднаўлення і рэканструкцыі дзейнічаюць да цяперашняга часу.

У гэтым выданні зроблена спроба даць звесткі пра развіццё дарэвалюцыйнай прамысловасці ў сучасных межах БССР. Ва ўсіх папярэдніх публікацыях іншых аўтараў яны прыводзіліся прыблізна. Адны даследчыкі для аналізу бралі звесткі па 5 беларускіх губернях /Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай/, на долю якіх прыпадала толькі 77% сучаснай тэр. БССР; у гэтым выпадку ў навуковы абарот не трапляла вялікая колькасць прамысловых прадпрыемстваў, што знаходзіліся на 23% тэр. сучаснай Беларусі. Другія выкарыстоўвалі звесткі па 35 паветах, цэнтры якіх у савецкі час знаходзіліся на тэр. БССР; у гэтым выпадку у лік беларускіх уключаліся прадпрыемствы на значнай тэрыторыі паветаў, якая ў склад БССР цяпер не ўваходзіць. Такім чынам, гісторыя прамысловасці дарэвалюцыйнай Беларусі істотна скажалася.

Аналіз і абгрунтаванне прыведзеных у кнізе матэрыялаў зроблены на аснове шматлікіх архіўных звестак, апублікаваных дакументаў, статыстычных справаздач, кніжных і часопісна-газетных публікацый, рэдкіх дарэвалюцыйных выданняў. У канцы кнігі змешчаны спіс асноўных крыніц выкарыстанай інфармацыі (нумар адпаведнай крыніцы даецца пад артыкулам больш жырным шрыфтам). Гэта будзе карысна вучоным і краязнаўцам для больш глыбокага вывучэння праблем па гісторыі прамысловасці Беларусі. У некаторых артыкулах спасылкі на крыніцы інфармацыі адсутнічаюць; гэтыя матэрыялы падрыхтаваны на аснове звестак навуковай картатэкі, створанай у інстытуце эканомікі АН БССР.

У параўнанні з іншымі публікацыямі на гэтую тэму прыведзеныя ў кнізе звесткі пакуль што з'яўляюцца найбольш поўнымі, але і яны, вядома, не могуць прэтэндаваць на вычарпальнасць і поўную дакладнасць. Перш за ўсё ёсць некаторы элемент верагоднасці ў прыведзеных датах існавання

прамысловых прадпрыемстваў: з мноства гадоў за якія сабраны звесткі аб дзейнасці пэўнага прадпрыемства, за год яго заснавання ўзяты самы ранні з выяўленых гадоў, а за апошні – адпаведна самы позні. Некаторыя звесткі пра адны і тыя ж прадпрыемствы не супадаюць з падобнымі звесткамі ў іншых публікацыях. Могуць быць і некаторыя разыходжанні ў назвах прадпрыемстваў і іх сучасным размяшчэнні. Энцыклапедычны прынцып алфавітнага размяшчэння артыкулаў патрабуе прывязкі назвы прадпрыемства да месца яго размяшчэння. Таму шэраг назваў утвораны ад былых малавядомых хутароў, урочышчаў. Не выключана, што ў некаторых іншых крыніцах назвы тых жа прадпрыемстваў могуць паходзіць ад назваў больш буйных бліжэйшых населеных пунктаў.

Для характарыстыкі аб'ёмаў прамысловай вытворчасці часам выкарыстаны старыя адзінкі вымярэння, якія з дапамогай адпаведнай табліцы ў канцы кнігі можна перавесці ў сучасныя. Населеныя пункты, дзе размяшчаліся прадпрыемствы, як правіла, дадзены і па старым і новым адміністрацыйным падзеле. У тых выпадках, дзе немагчыма ўстанавіць новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, названа толькі старая адміністрацыйная адзінка.

Магчыма, з цягам часу даследчыкі знойдуць новыя, пакуль не вядомыя крыніцы інфармацыі, некаторыя прыведзеныя ў гэтай кнізе звесткі будуць дапоўнены, удакладнены. Але і прадстаўлены матэрыял дапаможа ліквідаваць многія прабелы ў эканамічнай гісторыі Беларусі: больш акрэслена асэнсаваць вытокі і ўзровень прамысловага развіцця дарэвалюцыйнай Беларусі, прадпасылкі фарміравання рабочага класа, яго рэвалюцыйнай актыўнасці і перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі.

## СПІС АСНОЎНЫХ ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Абезгауз З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1971.

2. Яго ж. Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. /1900–1913гг./. Мн., 1977.

3. Адресная книга фабрично-заводской и ремесленной промышленности всей России. 3 изд. Спб., 1912.

4. Акционерно-паевые предприятия России. М., Спб., 1917.

5. Аникиевич К.Т. Сенненский уезд Могилёвской губернии. Могилёв, 1907.

6. Баркоўскі С., Скардзіс В. Аб жалезнай прамысловасці на Беларусі: /Гіст. даведка/ // Сав. краіна. 1931. № 12.

7. Без-Корнилович М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855.

8. Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. документов и материалов: В 3 т. Т. 2–3. Мн., 1960–61.

9. Бобровский П. Историческая монография г. Гродно // Вестн. Зап. России. 1866. Т. 3, № 7.

10. Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии, 1860–1900. Мн., 1978.

11. Яго ж. Развитие промышленности в Белоруссии /1795–1861 гг./. Мн., 1966.

12. Виленские губернские ведомости. 1838–1916.

13. Виленский вестник. 1898. № 138.

14. Витебские губернские ведомости. 1838–1917.

15. Вишневский А.Ф. Мануфактурное производство городов Белоруссии в 30–50-х годах XIX в. // Вопросы истории: Межвуз. сб. Мн., 1975. Вып. 2.

16. Воблый К.Г. Очерки по истории польской фабричной промышленности. Т. 1 /1764–1830/. Киев, 1909.

17. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. 8, ч. 1. Витебская губерния. Спб., 1852.

18. Тое ж. Т. 8, ч. 3. Могилёвская губерния. Спб., 1848.

19. Тое ж. Т. 9, ч. 2. Виленская губерния. Спб., 1848.

20. Тое ж. Т. 9, ч. 3. Гродненская губерния. Спб., 1849.

21. Тое ж. Т. 9, ч. 4. Минская губерния. Спб., 1848.

22. Волости и важнейшие селения Европейской России. Вып. 5. Губернии Литовской и Белорусской областей. Спб., 1886.

23. Волошин И.Ф. Развитие энергетики Белоруссии. Мн., 1960.

24. Вся Белоруссия: Справ. кн. на 1925 г. Мн., 1925.

25. Вся Россия: Рус. кн. пром-сти, торговли, сел. хоз-ва и администрации: Адрес-календарь Российской империи. Т. 1–2. [Спб.], 1900–02.

26. Гибянский И.Г. Граф Антоний Тизенгауз и гродненские королевские мануфактуры. Пг., 1916.

27. Гольбин Я.А. Развитие стекольной промышленности БССР за годы Советской власти. [Мн.], 1958.

28. Городков Г.И. Отчёт за 1885 г. фабричного инспектора Виленского округа Г.И.Городкова. Спб., 1886.

29. Гродненские губернские ведомости.1838–1915.

30. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2–3. Мн., 1940–53.

31. Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилёвской губернии: В 3 кн. Кн. 2. Могилёв, 1884.

32. Дудкоў Д.А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX стагоддзя. Мн., 1932.

33. Ежегодник Министерства финансов. Вып. 1 – [29]. Спб., 1869–1903.

34. Жаврид М.Ф. Белорусское стекло. Мн., 1969.

35. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Спб.; М., 1882.

36. Журнал мануфактур и торговли. 1829. № 4, 6; 1830. № 4; 1831. № 9.

37. Жучкевич В.А., Малышев А.Я., Рогозин Н.Е. Города и села Белорусской ССР: Ист.-геогр. очерки. Мн., 1959.

38. Закалинская Е.П. Вотчинные хозяйства Могилёвской губернии во второй половине ХУШ века. Могилёв, 1958.

39. Земкевіч Р. Цукраварні на Беларусі. Б. м., [1918].

40. Из истории рабочего класса и революционного движения: Памяти акад. А.М.Панкратовой: Сб. ст. М., 1958.

41. Кернажыцкі К.І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы ХУШ і першай палове XIX ст. Мн., 1935.

42. Козловский П.Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине ХУШ в. Мн., 1974.

43. Крюков П. Очерк мануфактурно-промышленных сил Европейской России... Ч. 2. Спб., 1853.

44. Лебедев С.М. Гомель: /Ист.-экон. очерк/. 2 изд. Мн., 1962.

45. Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии /П половина XIX в./. Мн., 1971.

46. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Виленская губерния /Сост. А.Корева. Спб., 1861.

47. Тое ж. Гродненская губерния. Ч. 2/Сост. П.Бобровский. Спб., 1863.

48. Тое ж. Минская губерния. Ч. 2 /Сост. И.Зеленский. Спб., 1864.
49. Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распада феадалізму. № 1–2. Мн., 1934–35.
50. Мейер А. Описание Кричевского графства 1786 // Могилёвская старина. 1901. Вып. 2.
51. Минские губернские ведомости. 1878. № 5.
52. Могилёвские губернские ведомости. 1849–67.
53. Населённые места Российской империи в 500 и более жителей... по данным всеобщей переписи населения 1897 г. Спб., 1905.
54. Наш край. Мн., 1925–28.
55. Обзор различных отраслей мануфактурной промышленности России. Т. 1–3. Спб., 1862–65.
56. Обзор сельскохозяйственной и кустарно-промышленной выставки, устроенной Могилёвским обществом сельского хозяйства в г. Могилёве-на-Днепре в 1896 году. Могилёв, 1897.
57. Памятная книжка Виленской губернии. Вильна, 1889.
58. Памятная книжка Витебской губернии. Витебск, 1867–98.
59. Памятная книжка Гродненской губернии. Гродно, 1888.
60. Памятная книжка Минской губернии. Мн., 1878.
61. Памятная книжка Могилёвской губернии. Могилёв, 1887–93.
62. Фабрично-заводская промышленность России: Перечень фабрик и заводов. Спб., 1897.
63. Погожев А.В. Учёт численности и состава рабочих в России. Спб., 1906.
64. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1972. № 1.
65. Промышленность. Спб., 1861–62.
66. Рабочее движение в России в XIX веке: Сб. документов и материалов. Т.1–4. М., 1950–61.
67. Романовский Н.Т. К вопросу о возникновении и развитии мануфактурной промышленности в Белоруссии // Тр. геогр. фак. Белорус. гос. ун-та. 1958. Вып. 2.
68. Яго ж. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии /вторая половина ХУШ – первая половина XIX века/. Мн., 1966.
69. Свод данных о фабрично-заводской промышленности России. Спб., 1890–97.
70. Список землевладельцев Минской губернии за 1876 г. Мн., 1877.
71. Список фабрик и заводов Европейской России. Спб., 1903.
72. Список фабрик и заводов России. [2 изд.] М., [1910].
73. Список фабрик и заводов Российской империи. Спб., 1912.

74. Статистические сведения о фабриках и заводах по производствам, не обложенным акцизом за 1900 г. Спб., 1903.

75. Тимирязев Д.А. Статистический атлас главнейших отраслей фабрично-заводской промышленности Европейской России с поименным списком фабрик и заводов. Вып. 1–3. Спб., 1870–73.

76. Титок В.А. Из истории формирования железнодорожного пролетариата Белоруссии в конце XIX в. // Материалы IX конф. молодых учёных: Вопр. истории. Мн., 1965.

77. Торговля и промышленность Европейской России по районам. Вып. 2, 11. Спб., [1904].

78. Труды имп. Вольного экономического общества. Спб., 1860–64.

79. Указатель фабрик и заводов Европейской России... 3 изд. Спб., 1894.

80. Улащик Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965.

81. Умецкий Б.И. Речица: Краткий ист.-экон. очерк. Мн., 1963.

82. Фабрично-заводские предприятия Российской империи. Спб., 1914.

83. Хорош И. По промышленной черте оседлости: Путевые наброски // Книжки Восхода. 1901. Кн. 10–12.

84. Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 1 /1883–1918 гг./. Мн., 1962.

85. Чатырохсотлецце беларускага друку, 1525–1925. Мн., 1926.

86. Чепко В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. Мн., 1966.

87. Чернявский И. Перспективы свеклосеяния и развития сахарной промышленности в БССР. Мн., 1948.

88. Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Спб., 1858.

89. Экономика Белоруссии в эпоху империализма 1900–1917. Мн., 1963.

90. Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861–62 гг. Ч. 1. Спб., 1863. 4. Виленская губерния.

91. Там жа. 5. Витебская губерния.

92. Там жа. 11. Гродненская губерния.

93. Там жа. 19. Минская губерния.

94. Там жа. 20. Могилёвская губерния.

ЦДГА БССР – цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР

ЦДГА ЛітССР – цэнтральны дзяржаўны архіў Літоўскай ССР

ЦДАКР БССР – цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР.

## ПАРАЎНАЛЬНАЯ ТАБЛІЦА СТАРЫХ І НОВЫХ АДЗІНАК ВЫМЯРЭННЯ

**Аршын** – мера даўжыні = 16 вяршкам = 71,12 см;

**Асміна** – мера аб'ёму сыпкіх цел = 4 пудам жыта /16 –пач. 17 ст./, потым – 6 пудам, з апошняй чвэрці 17 ст. – 8 пудам жыта;

**Беркавец** – мера масы /вагі/ = 10 пудам = 1,638 ц = 163,8 кг;

**Бочка** – мера аб'ёму вадкасці = 40 вёдрам = 491,96 л;

**Бутэлька вінная** – мера аб'ёму вадкасці = 1/16 вядра = 0,77 л;

**Бутэлька гарэлачная /піўная/** – мера аб'ёму вадкасці = 1/20 вядра = 0,624 л;

**Вядро** – мера аб'ёму вадкасці = 4 гарцам = 12,3 л;

**Вярста** – мера даўжыні = 500 сажням = 1,0668 км;

**Вяршок** – мера даўжыні = $1^3/_4$ дзюйма = 1/16 аршына = 4,45 см;

**Гарнец** – мера аб'ёму вадкасці = 1/4 вядра = 3,0748 л = 5 гарэлачных ці 4 вінныя бутэлькі; або мера аб'ёму сыпкіх цел = 1/8 чацвярыка = 3,2798 л;

**Градус /спірту/** – працэнтнае ўтрыманне спірту /алкаголю/ у аб'ёме вады; у 3 л 40-працэнтнай гарэлкі лічылі 1 градус спірту, у вядры – 4 градусы спірту;

**Дзесяціна** – мера плошчы = 2400 сажням$^2$ = 1,09 га;

**Дзюйм** – мера даўжыні = 1/12 фута = 2,54 см;

**Капа** – 60 штук /адзінак/;

**Кусок /тканіны/** – 24–30 аршын /у залежнасці ад шырыні/;

**Локаць** – мера даўжыні = 45,5–47,5 см /у рускіх/, 65,6 см /у літоўцаў/, 59,5 см /у палякаў/;

**Пуд** – мера масы /вагі/ = 40 фунтам = 16,38 кг;

**Сажань** – мера даўжыні = 3 аршынам = 7 футам = 48 вяршкам = 2,134 м; 1 сажань$^2$ = 9 аршынам$^2$; 1 сажань$^3$ = 27 аршынам$^3$;

**Скрынка /шкла/** = 120 лістоў /памер ліста 15 x 14 або 16 x 15 вяршкоў/;

**Скрынка /запалак/** = 100 карабкоў запалак;

**Стапа** – мера паперы; 1 стапа = 480 аркушаў, якія адпавядаюць 1000 сучасных стандартных аркушаў /21 x 30 см/;

**Фунт** – мера масы /вагі/ = 1/40 пуда = 0,409 кг;

**Фут** – мера даўжыні = 1/7 сажня = 12 дзюймам = 0,3048 м;

**Чацвярык** – мера аб'ёму сыпкіх цел = 8 гарцам = 26,24 л.

Справочное издание

ПРОМЫШЛЕННЫЕ ПРЕДПРИЯТИЯ ДОРЕВОЛЮЦИОННОЙ БЕЛОРУССИИ

Автор-составитель Болбас Максим Федорович

Минск, издательство "Белорусская Советская Энциклопедия" имени Петруся Бровки

На белорусском языке

Даведачнае выданне

ПРАМЫСЛОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСІ

Аўтар-складальнік Болбас Максім Фёдаравіч

Рэдактар: *С.В.Курач, Н.П.Саламевіч*
Мастацкі рэдактар *А.І.Палуян*
Вокладка *Я.Ф.Леўчанкі*
Тэхнічны рэдактар *І.І.Цыцаня*
Арыгінал-макет да друку падрыхтавала аператар
*Т.Л.Барысоўская*
Карэктары: *В.І.Баграновіч, Р.Р.Блашко, Н.А.Дзянісава, Т.Я.Радзевіч, А.Ф.Федасеева.*

БЗ № 154

Набрана на НДТ. Падпісана да друку з арыгінал-макета 12.08.88. АТ 14087 . Фармат 60 х $84^1/_{16}$. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 18,83. Ум. фарб.-адб. 19,4. Ул.-выд. арк. 13,38. Тыраж 1500 экз. Зак. 165. Цана 80 к.

Выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. 220600, Мінск, вул. Акадэмічная, 15 а.

Надрукавана на ратапрынце выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. 220600, Мінск, вул. Акадэмічная, 15 а.

Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Бела-
П 69 сі. /Аўт.-скл. М.Ф.Болбас. -- Мн.: БелСЭ, 1988. -- 324 с. --
/Энцыкл. б-чка "Беларусь"/.
1 В 5-85700-022-Х

Промышленные предприятия дореволюционной Белоруссии.

Якія фабрыкі і заводы былі у вашым горадзе да рэвалюцыі? Што яны выпускалі? Як былі аснашчаны? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наша кніга. Яе артыкулы і табліцы змяшчаюць звесткі аб прамысловых прадпрыемствах дарэвалюцыйнай Беларусі.

Прафесійным гісторыкам, краязнаўцам і супрацоўнікам экскурсійных бюро, а таксама ўсім тым, хто любіць свой край і цікавіцца яго гісторыяй будзе гэта кніга.

П $\frac{0505040000-010}{М 318 /03/ - 88}$ БЗ 154-8 ББК 63.3/2Б/